# Пра праект PISA

“Якімі ведамі і ўменнямі павінны валодаць грамадзяне?” Менавіта гэтае пытанне адлюстроўвае мэту даследавання сярод 15-гадовых школьнікаў, што праводзіцца кожныя тры гады ва ўсім свеце пад назвай "Міжнародная праграма ацэнкі школьнікаў PISA". PISA праграма ацэньвае ўзровень ведаў і ўменняў навучэнцаў напрыканцы абавязковага навучання, якія вельмі неабходныя для паўнавартаснага ўдзелу ў жыцці сучаснага грамадства.

З 2000 года PISA ацэньвае вучняў ва ўсім свеце па ключавых прадметах: чытанні, матэматыцы і прыродазнаўчых навуках. Ацэньванне таксама ўключае збор інфармацыі пра досвед вучняў і пра тое, як наладжана кіраванне ў школах, каб вызначыць фактары, што ўплываюць на паспяховасць навучання.

PISA рэгулярна ўкараняе новыя тэсты для ацэнкі ўменняў вучняў у іншых сферах, істотных для сучаснага жыцця. Напрыклад, ўменне крэатыўна падыходзіць да рашэння задач па фінансавай граматнасці (упершыню праведзена ў 2012 годзе), вырашэнне праблем шляхам супрацоўніцтва (ацэньванне праводзілася ў 2015 годзе).

**Нацыянальны цэнтр PISA 2018 у Рэспубліцы Беларусь:**

**УА "Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў"**
**220049, г. Мінск, вул. Чайкоўскага, 7.**
**Тэл. (017) 237-06-66, факс (017) 267-85-23**
**e-mail: pisa@rikc.by**

**Нацыянальны мэнеджэр праекта: Міксюк Ю. І.**
**Рабочая група: Якабчук А. П., Хахлова Ю. С.**

## Краіны, якія ўдзельнічаюць у Міжнароднай праграме ацэнкі адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA 2018

ААЭ
Азербайджан (Баку)
Албанія
Алжыр
Аргенціна
Аўстралія
Аўстрыя
Балгарыя
Беларусь
Бельгія
Боснія і Герцагавіна
Бразілія
Бруней Дарусалам
Венгрыя
В'етнам
Вялікабрытанія
Ганконг, Кітай
Германія
Грузія
Грэцыя
Дамініканская Рэспубліка
Данія
ЗША
Іарданія
Ізраіль
Інданэзія
Ірландыя
Ісландыя
Іспанія
Італія
Казахстан
Калумбія
Канада
Карэя
Катар
Кітайскі Тайбэй
Косава
Коста-Рыка
Латвія
Ліван
Літва
Люксембург
Малайзія
Малдова
Мальта
Макаа, Кітай
Македонія
Марока
Мексіка
Нарвегія
Нідэрланды
Новая Зеландыя
Панама
Партугалія
Перу
Польшча
Расія
Румынія
Саудаўская Аравія
Сербія
Сінгапур
Славакія
Славенія
Тайланд
Трынідад і Табага
Турцыя
Украіна
Уругвай
Філіпіны
Фінляндыя
Францыя
Харватыя
Чарнагорыя
Чылі
Чэхія
Шатландыя
Швейцарыя
Швецыя
Эстонія
Японія

*Краіны-члены АЭСР*





За дадатковай інфармацыей, калі ласка, звяртайцеся на сайт: **www.oecd.org/pisa**, або па электроннай пошце: pisa@rikc.by

OECD

# Міжнародная праграма ацэнкі адукацыйных дасягненняў навучэнцаў PISA 2018

Міжнароднае тэсціраванне АЭСР ацэньвае ўзровень ведаў 15-гадовых вучняў па ключавых кампетэнцыях спрыяе паляпшэнню якасці і эфектыўнасці адукацыйных сістэм



**УА "Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў"**

# Што робіць праект PISA асаблівым?

Вынікі PISA адлюстроўваюць магчымасці адукацыі, дэманструюць дасягненні вучняў з краін, у якіх адукацыйныя сістэмы найбольш дынамічна паляпшаюцца і паказваюць найбольш высокія паказчыкі.

**Пытанні кіравання:** PISA дапамагае зацікаўленым бакам ацаніць, якія сёння ёсць магчымасці ў школы, каб добра падрыхтаваць моладзь да дарослага жыцця, а таксама ці з'яўляюцца адукацыйныя сістэмы справядлівымі, наколькі метады навучання адных школ больш эфектыўныя, чым другіх.

**Пісьменнасць:** замест ацэнкі валодання матэрыялам школьнай праграмы па канкрэтным прадмеце PISA засяроджвае ўвагу на здольнасці вучняў прымяніць атрыманыя ў школе веды ў сапраўдных жыццёвых сітуацыях.

**Адукацыя на працягу ўсяго жыцця:** PISA не толькі разглядае паспяховасць вучняў, але і даследуе іх патэнцыял да навучання на працягу ўсяго жыцця праз пытанні пра іх матывацыю, упэўненасць і ўласныя стратэгіі навучання.

**Дынаміка паспяховасці:** краіны, што паслядоўна прымаюць удзел у цыклах праекта PISA, могуць параўнаць паспяховасць сваіх вучняў у дынаміцы і ацаніць уплыў прынятых рашэнняў у адукацыйнай палітыцы




# Ключавыя факты пра PISA

**Змест:** даследванне PISA 2018 засяродзіцца на чытанні, а матэматыка і прыродазнаўчыя навукі будуць уключаны ў экзамен больш дробнымі блокамі. Акрамя таго, у PISA 2018 упершыню будзе ўключаны раздзел па глабальнай кампетэнцыі.

**Вучні:** больш за 510 000 вучняў прайшлі тэсціраванне ў 2015 годзе, яны прадставілі больш за 28 мільёнаў 15-гадовых падлеткаў са школ 72 краін-удзельніц.

**Ацэньванне:** пачынаючы з 2018 года тэсціраванне будзе праводзіцца ў выглядзе камп'ютарнага тэсту, які працягваецца дзве гадзіны. Некаторыя пытанні тэсту прапаноўваюць некалькі варыянтаў адказу на выбар, а некаторыя патрабуюць ад вучняў даць адказ самастойна. З прыкладамі заданняў можна азнаёміцца па спасылцы: www.oecd.org/pisa/test

Вучні таксама адказваюць на пытанні анкеты, у якую яны павінны занесці інфармацыю пра сябе, пра свой дом, школу і вопыт навучання. Кіраўніцтву школ таксама будзе прапанавана апытанне наконт школьнай сістэмы і навучальнага асяроддзя.

У некаторых краінах бацькі таксама праходзілі апытанне: збіралася інфармацыя пра іх уражанні ад школ, у якіх вучацца іх дзеці, пра ўдзел у школьным жыцці, падтрымку ў навучанні дома і пра тое, чаго яны чакаюць ад вучобы іх дзяцей у будучым.



# Вынікі PISA

Кіраўніцтва дзяржавы выкарыстоўвае вынікі PISA для таго, каб даведацца пра ўзровень ведаў і уменняў вучняў сваёй краіны ў параўнанні з вынікамі іншых краін, вызначыць палітычныя паказчыкі ў параўнанні з узроўнем, які дасягнулі іншыя адукацыйныя сістэмы, а таксама вучыцца на практычных прыкладах, што выкарыстоўваюцца ў іншых краінах.
Сярод іншага, вынікі PISA сведчаць пра тое, што:

- у эканоміках з нізкім прыбыткам сродкі, затрачаныя на адукацыю, з'яўляюцца істотным фактарам паляпшэння паспяховасці навучання;
- эфектыўныя школьныя сістэмы ў эканоміках з высокім прыбыткам імкнуцца надаваць больш значэння ўзроўню кваліфікацыі настаўнікаў, чым памеру класаў;
- паляпшэнні ў паспяховасці адукацыйнага працэсу магчымыя незалежна ад пачатковага ўзроўню вучняў, школ і адукацыйных сістэм. Тым не менш, такія паляпшэнні не з'яўляюцца непазбежнымі і патрабуюць сістэматычных намаганняў ад палітыкаў, настаўнікаў, бацькоў, вучняў і ўсяго грамадства;
- калі вучні застаюцца на паўторны год навучання – гэта дарагі сродак, які не з'яўляецца шляхам да паляпшэння паспяховасці на ўзроўні сістэмы.



Explore data



Дадатковая інфармацыя: **www.rikc.by**